WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

9 жніўня 2011 г.
АЎТОРАК
№ 149 (27013)
Кошт 700 рублёў

## ШКОЛЬНЫ РАНЕЦ МОЖНА БУДЗЕ КУПІЦЬ У КРЭДЫТ

***Ільготны крэдыт бацькі змогуць узяць для таго, каб апрануць і абуць сваё дзіця ў школу***

Адпаведная магчымасць прадугледжана Пастановай Савета Міністраў № 1052 ад 6 жніўня 2011 года. У прыватнасці, у крэдыт можна будзе набыць вопратку і абутак для дзяцей, вучнёўскія ранцы і заплечнікі, а таксама маладзевыя сумкі. Але ўсе гэтыя тавары павінны быць беларускай вытворчасці.

Скарыстацца нормамі гэтай пастановы можна будзе толькі да 1 кастрычніка гг. Што тычыцца канкрэтных умоў выдачы льготных крэдытаў на набыццё тавараў для дзяцей (працэнтная стаўка, тэрміны, максімальная сума крэдыту і г. д.), то, як патлумачылі «Звяздзе» ў прэс-службе ААТ «ААБ Беларусбанк», гэтыя ўмовы яшчэ пакуль невядомыя і мусяць быць апублікаваныя ў бліжэйшы час.

Нагадаем, што ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта № 371 ад 6 ліпеня 2009 года «Аб ільготным спажывецкім крэдытаванні» толькі крэдыты прадстаўляюцца банкамі ў беларускіх рублях тэрмінам да трох гадоў з аплатай 10% гадавых за карыстанне крэдытам.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

### Надвор'е

## У БЛІЖЭЙШЫЯ ДНІ БУДЗЕ ДАЖДЖЛІВА І ХАЛАДНАВАТА

**Упачатку гэтага тыдня чакаецца дажджлівае і халаднаватае надвор'е, да выхадных пацяплее. Аб гэтым паведаміла БЕЛТА <u>галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Людміла ПАРАШЧУК.</u>**

У сераду больш халаднаватыя, але па-ранейшаму вільготныя паветраныя масы пачнуць паступаць з тэрыторыі Заходняй Еўропы. Чакаюцца кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы — 8—15 градусаў, максімальная днём — 16—23 градусы цяпла.

У чацвер дажджоў стане менш, з'явіцца больш праясненняў. Тэмпература паветра пад раніцу панізіцца да 6—11 градусаў, максімальная днём складзе плюс 16—23. Месцамі чакаюцца кароткачасовыя навальнічныя дажджы. У пятніцу характар надвор'я істотна не зменіцца.

А вось у выхадныя будзе паступаць больш цёплае паветра. Мінімальная тэмпература паветра ўначы — плюс 7—14, удзень — ад 18—20 на паўночным усходзе рэспублікі да 25—27 цяпла на паўднёвым захадзе Брэсцкай вобласці.

У нядзелю атмасферны ціск пачне расці, дажджы магчымы толькі ў асобных раёнах на паўночным усходзе краіны. Тэмпература паветра павысіцца ў дзённыя гадзіны ад 20—25 на паўночным усходзе да 26—28 цяпла на паўднёвым захадзе рэспублікі.

### Наш дзень




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗА ШЭСЦЬ КРОКАЎ ДА СТАГОДДЗЯ

**ДЗЕНЬ нараджэння трэба сустракаць разам з сябрамі. А калі іх шмат, як у любога доўгажыхара?.. Я маю на ўвазе нашых падпісчыкаў, якія сёння, 9 жніўня, могуць адзначыць свята сваёй газеты, што была заснавана 94 гады таму. Такім чынам, святкаваць сёння могуць у 33 380 сем'ях (сярод якіх ёсць і буйныя арганізацыі, і школы, і бібліятэкі) па ўсёй нашай краіне. Сама віноўніца свята — славутая газета з лёсам, багатым і на выпрабаванні, і на сустрэчы, — лічыць для сябе лепшым падарункам на свята — тых, хто быў і ёсць з намі. Кожны наш чытач — як нашчадак сапраўднага доўгажыхара, які імкнецца перадаць блізкім людзям розум, традыцыі папярэднікаў і надзеі на добрую і годную будучыню. Людзі — вось дзе наша багацце, якое ў розныя гады «звяздоўцы» нажывалі і дзеля якога працуюць зараз, імкнучыся вывесці формулу любові — да сваёй краіны, да ўсяго, што робіць яе непадобнай на іншых і што вызначае яе твар. Разам мы робім крокі да таго, каб ажыццявіць агульную мару, якая аб'ядноўвае ўсіх людзей гэтай краіны: стварыць на нашай роднай зямлі годнае жыццё, каб кожнаму было ўтульна пад беларускім небам. Гэта для нас і лёс, і любоў, і шчасце: усё, што можа несці сэнс назвы «Звязда». У беларускім фальклоры гэта слова сустракаецца як сімвал свята і шчодрасці, якія будуць спадарожнічаць чалавеку ўвесь год ад яго пачатку. Калядная звязда была сімвалам надзеі на добры год. Таму што мы ўсе — кожны з нас па-асобку і ўсе разам — толькі за ўсё добрае... Бачыць добрае, шукаць добрае можна і штодня. Але ў свята гэтага хочацца асабліва. Вядома, усю краіну не аб'едзеш, каб спытаць кожнага нашага чытача пра яго добрае. Але мы пайшлі іншым шляхам...**

### Крок першы: ГЭТА ЛЁС

Не так даўно (у 2005-м было прынятае гэтае рашэнне) у сталіцы Беларусі з'явіўся праспект газеты «Звязда». Самая старэйшая з усіх беларускіх штодзённых газет была адзначана такім гонарам. Каб яго адчуць і паглядзець на твары людзей з праспекта, я вырашыла прайсці, пашпацыраваць па ім. Яшчэ і таму, што быць сярод людзей для журналіста нашай газеты — гэта сапраўды свята. А пайсці «ў народ», ды яшчэ на праспекце «Звязды», напярэдадні нашага свята — асаблівая місія.

СТАР. 4

## ФАМІЛЬНЫ «ГАЗОН»




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Міхаіл і Дзяніс Мінічы працуюць у СВК «Агарэвічы» Ганцавіцкага раёна. Міхаіл Аляксандравіч адвозіць хлеб са жніўных палеткаў. Яго сын Дзяніс — начальнік участка, на якім зараз ідзе жніво. Між іншым, гэтым аўтамабілем «ГАЗ-3307» кіраваў старэйшы з дынастыі Мінічаў, Аляксандр Іванавіч. Дзяніс памятае, як у дзяцінстве прыязджаў на ім разам з дзедам на палі. Цяпер старэнькі дзедаў «газон» па-ранейшаму возіць з поля хлеб.**

ISSN 1990 - 763X

АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ
WWW.RLT.BY

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «СлуцкОблГарант» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже:**

<u>**Лот № 1:**</u> здания телемастерской (инв. № 623/С30590), об. пл. 215,4 кв.м, расположенного по адресу: **Минская обл., Узденский р-н, г. Узда, пл. Свободы, д. 3.**

**Начальная цена с НДС – 100 764 000 бел. руб.**

**Площадь земельного участка – 0,0422 га.**

**Объект обременен договорами аренды.**

<u>**Лот № 2:**</u> изолированного помещения телемастерской (инв. № 631/D-7701), об.пл. 102,8 кв.м, расположенного по адресу: **Минская обл., Вилейский р-н, г. Вилейка, ул. Пионерская, д. 47, пом.1.**

**Начальная цена с НДС – 80 419 000 бел. руб.**

Задаток 10% от начальной цены объекта (лота) **перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Банк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015 Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, ***если иное не предусмотрено договором купли-продажи.***

**Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.**

Аукцион состоится **13.09.2011** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **12.09.2011** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34; 500 47 12.**

АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ
WWW.RLT.BY

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» **(организатор аукциона),** по поручению ОАО «Вишневка-2010» **(продавец),** проводит открытый аукцион по продаже **зерносушильного комплекса**, расположенного по адресу: **Минская обл., Минский р-н, Юзуфовский с/с, район д. Юзуфово,** в составе: **зерносклад** (инв. № 600/С-128578), об. пл. 403,9 кв.м; **зерносклад** (инв. № 600/С-128577), об. пл. 690,8 кв.м, **склад минеральных удобрений** (инв. № 600/С-128872), об. пл. 140,2 кв.м; **площадка-ток** (инв. № 600/С-129138).

**Начальная цена с НДС – 1 586 610 000 бел. руб.**

Площадь земельного участка – **1,4228 га** (ограничения: водоохранная зона реки Чернявка – 0,1656 га; охранная зона линий электропередачи напряжением до 1000 Вольт – 0,0285 га).

**Земельный участок предоставлен продавцу на праве постоянного пользования.**

Задаток в сумме 100 000 000 бел. руб. перечисляется на **р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Банк» г. Минск, БИК 153001369, УНП 690324015,** Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

**Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней после проведения аукциона.**

<u>*Оплата за объект должна быть произведена победителем аукциона (покупателем) в течение 10 (десяти) банковских дней со дня проведения аукциона.*</u>

**Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.**

Аукцион состоится **09.09.2011** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **08.09.2011** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34; 500 47 12.**

# АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАТРАБУЕ АД СПАРТСМЕНАЎ-ВЕСЛЯРОЎ МАКСІМАЛЬНА ВЫСОКІХ ВЫНІКАЎ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка патрабуе максімальна высокіх рэзультатаў ад выступленняў спартсменаў-весляроў, у падрыхтоўку якіх дзяржава ўкладвае вялікія сродкі. Аб гэтым кіраўнік дзяржавы заявіў учора, наведваючы Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі па вяслярных відах спорту, размешчаны ў Заслаўі, перадае БЕЛТА.**

У 2012 годзе ў Лондане пройдуць XXX летнія Алімпійскія гульні, да якіх цяпер узмоцнена рыхтуюцца беларускія спартсмены па веславанні на байдарках і каноэ, а таксама акадэмічным веславанні. У прыватнасці, Міністэрства спорту і турызму давяло нацыянальнай камандзе Беларусі па веславанні на байдарках і каноэ планавыя паказчыкі па заваяванні трох алімпійскіх медалёў.

Як праінфармавалі Прэзідэнта, з 28 жніўня па 4 верасня ў славенскім горадзе Блед беларуская нацыянальная каманда (5 экіпажаў) будзе ўдзельнічаць у чэмпіянаце свету па акадэмічным веславанні, які з'яўляецца кваліфікацыйным на права ўдзелу ў Алімпійскіх гульнях у Лондане. Прагноз выступлення — адзін медаль і тры алімпійскія ліцэнзіі.

Размаўляючы са спартсменамі-веслярамі, у ліку якіх была алімпійская чэмпіёнка Кацярына Карстэн, Прэзідэнт Беларусі выказаў меркаванне, што нашы вясляры павінны паказаць выдатныя вынікі, паколькі ў іх падрыхтоўку ўкладваюцца каласальныя сродкі. Менавіта для высокіх перамог на міжнародным узроўні была праведзена рэканструкцыя вяслярнага канала Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі па вяслярных відах спорту ў Заслаўі.

У адпаведнасці з указам Прэзідэнта ад 17 ліпеня 2006 года Міністэрству спорту і турызму было даручана ажыццявіць рэканструкцыю вяслярнага канала Рэспубліканскага цэнтра, будаўніцтва яго інжынернай і транспартнай інфраструктуры. У 2008 годзе ўведзена ў эксплуатацыю гідратэхнічная частка аб'екта. У верасні 2009 года пабудаваны лабараторны корпус і трансфарматарная падстанцыя. У мінулым годзе датэрмінова закончана будаўніцтва адміністрацыйна-бытавога корпуса, які ўключае сталовую, інтэрнат, тры трэнажорныя залы (зала сілавой падрыхтоўкі на 12 чалавек, вяслярны басейн на 8 чалавек, зала спецыяльнай падрыхтоўкі), чатыры эліні для захоўвання лодак; медыка-аднаўленчага цэнтра з 2 лазневымі комплексамі, газавай кацельні, фінішнай вышкі, інжынерных сетак.

Такім чынам, дзяржава, стварыўшы ўсе неабходныя ўмовы для спартсменаў-весляроў, чакае адпаведнай аддачы і выдатных вынікаў на маючых адбыцца чэмпіянаце свету і Алімпійскіх гульнях.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка лічыць мэтазгодным развіццё турыстычнай інфраструктуры вакол вяслярнага канала ў Заслаўі. Нароўні з правядзеннем на вяслярным канале міжнародных спаборніцтваў, забеспячэннем трэніровачнага працэсу каманд плануецца развіццё інфраструктуры турызму і аказанне турыстычных паслуг. Гэта будзе рабіцца з улікам таго, што вясляры канал размешчаны недалёка ад Мінска, побач з аўтамабільнай трасай, у прыгожай мясціне. Блізкасць вадаёмаў дае магчымасць арганізаваць пляжны адпачынак і рыбалку, карпаратыўны і сямейны адпачынак.

Як паведамілі Прэзідэнту, прапануецца выдзеліць чатыры зоны для турызму і адпачынку. У прыватнасці, гэта будзе дзелавы цэнтр з гасцініцай, рэстаранам, боўлінгам, спартзалай, лазневым комплексам, пунктам пракату аўтамабіляў. Зона адпачынку і рэкрэацыі прадугледжвае будаўніцтва турыстычнай вёскі з кавярняў, пракатам катамаранаў і лодак, лыжаролернай трасай, веладарожкай. Vip-зона прадугледжвае будаўніцтва SPA-цэнтра. У маладзёжна-турыстычнай зоне плануецца пабудаваць цэнтр воднага турызму, круглагадовае і сезоннае міні-кафэ, веладром, скаладром, пункт пракату турыстычнага рыштунку, турыстычны клуб з домікамі.

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў максімальна задзейнічаць існуючыя магчымасці для развіцця турызму, а значыць, заработку грошай.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### МАСАВЫЯ БЕСПАРАДКІ Ў ЛОНДАНЕ



**Паліцыя Лондана затрымала ўчора больш за 100 чалавек, якія маюць дачыненне да масавых беспарадкаў і пагромаў, што адбыліся ў брытанскай сталіцы ў мінулыя выхадныя. Апроч гэтага, яшчэ 61 чалавек быў затрыманы суботняй ноччу і раніцай у нядзелю. 16 чалавек атрымалі афіцыйныя абвінавачванні, а 17 былі вызвалены пад заклад, перадае CNN.**

Тым часам беспарадкі працягваюцца. Раніцай у панядзелак машына на вялікай хуткасці ўрэзалася ў паліцэйскіх, якія затрымлівалі марадзёраў. Трое вартавых парадку пацярпелі, але іх жыццю нішто не пагражае. З пачатку хваляванняў у Лондане пацярпела ўжо 35 афіцэраў паліцыі.

Акрамя таго, у панядзелак пажарным давялося тушыць агонь у абутковай краме. Усяго за выхадныя пажарныя тушылі 49 пажараў. Відавочцы распавядалі, што пасля масавых хваляванняў раён Тотэнхэм выглядаў як поле бітвы, піша BBC.

Беспарадкі тут успыхнулі ў ноч на нядзелю ў Тотэнхэме. Нагодай да іх паслужыла смерць пасажыра прыватнага таксі (міні-кэба) 29-гадовага Марка Дагана, якога ў перастрэлцы забіў паліцэйскі. Паліцыя дагэтуль не растлумачыла ні тое, чаму была спынена машына з Даганам, ні хто менавіта ў яго страляў.



Вядома толькі, што вартавыя парадку хацелі правесці вобыск у аўтамабілі. У перастрэлцы таксама быў паранены адзін з патрульных паліцэйскіх.

### БОЛЬШ ЗА 60 АДСОТКАЎ РАСІЯН АДМОЎНА АЦАНІЛІ РАБОТУ ДЗЯРЖДУМЫ

**Больш за 60 % расіян незадаволены працай Дзярждумы. Такія вынікі апытання «Левада-цэнтра». Пры гэтым працу парламента цяперашняга склікання негатыўна ацаніла 58 % рэспандэнтаў.**

Паводле слоў 45 % рэспандэнтаў, яны цікавяцца дзейнасцю Дзярждумы, у той час як 41 % расіян праца дэпутатаў не цікавіць. Разам з тым толькі 6 % апытаных заявілі, што добра ўяўляюць, чым дэпутаты займаюцца на працягу свайго тэрміна. Палова расіян «няясна ўяўляе» працу парламентарыяў, а 41 % апытаных не ведае пра дзейнасць дэпутатаў наогул нічога. Паводле звестак сацыёлагаў, расіяне лічаць, што цяпер чыноўнікі ў Расіі маюць прывілеяў больш, чым у СССР. Так думае 71 % рэспандэнтаў. 63 % апытаных упэўнены, што дзяржслужачых цяпер кантралююцца слабей, чым пры Савецкім Саюзе, а больш за палову расіян лічаць, што людзі ва ўладзе «заклапочаны толькі сваім матэрыяльным дабрабытам».

### ЛЮДЗІ, ЯКІЯ ПАЧЫНАЮЦЬ СВАЮ РАНІЦУ З ЦЫГАРЭТЫ, АСАБЛІВА РЫЗЫКУЮЦЬ ЗАРАБІЦЬ РАК



**Амерыканскія навукоўцы з Медыцынскага каледжа Пэн Стэйт даследавалі стан здароўя 7610 курцоў і заявілі: гэты эфект не залежыць ад іншых звычак курцоў. Так, калі чалавек выкурваў цыгарэту на працягу 30 хвілін пасля абуджэння, рызыка развіцця раку лёгкіх павялічвалася ў два разы, піша BBC.**

З усіх людзей, якія прымалі ўдзел у даследаванні, 4776 курцоў ужо мелі рак лёгкіх, а 2835 курцоў былі здаровыя. У параўнанні з тымі, хто выкурваў першую цыгарэту праз мінімум гадзіну пасля абуджэння, людзі, якія курылі амаль адразу, на 79% мелі больш шанцаў атрымаць рак. Прытым колькасць цыгарэт, якія выкурваліся за дзень, у цэлым на гэтыя паказчыкі не ўплывала.

### ВЫБУХНУЎ ПАЛІЎНЫ БАК ЗЕМСНАРАДА

**Бліжэй да поўначы пабліз вёскі Прудок Светлагорскага раёна ў затоне Бярэзіны адбыўся выбух газапаветранай сумесі ў паліўным баку плывучага земснарада. Гэтае судна тэхнічнага флоту для правядзення днопаглыбляльных работ і здабычы нярудных будаўнічых матэрыялаў водазмяшчэннем 40 тон. Належала яно рэспубліканскаму ўнітарнаму Днепра-Бярэзінскаму прадпрыемству водных шляхоў.**

У паліўным баку было 3,5 тоны дызельнага паліва. Адразу пасля выбуху пачаўся і гарэнне паліва, якое разлілося на плошчы 30 квадратных метраў. Увогуле забруджванне воднай паверхні затона (да Бярэзіны адлегласць была 1,5 кіламетра) склала 100 квадратных метраў. Падраздзяленні МНС пажар ліквідавалі, устанавілі бонавыя загароды, не дапусціўшы выхаду нафтапрадуктаў у Бярэзіну.

Капітан судна атрымаў апёкі першай-другой ступені 10 працэнтаў цела. Ён быў шпіталізаваны ў бальніцу. Версія прычыны здарэння наступная. Пасля запраўкі саляркай земснарада капітан судна пры дапамозе кішэннага ліхтарыка вырашыў падсвяціць у паліўную секцыю №1 для вызначэння ўзроўню паліва там. Пры ўключэнні ліхтарыка адбыўся выбух з наступным гарэннем дызпаліва. Зараз працуе раённая камісія па надзвычайных сітуацыях, высвятляюцца прычыны аварыі, вызначаюцца матэрыяльныя страты і нанесеная экалагічная шкода.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Дзяржкантроль

# Сянаж у выглядзе... падсцілачнага матэрыялу

**АСНОЎНАЙ прычынай недабору запланаваных аб'ёмаў малака і мяса з'явіўся недастатковы ўзровень кармлення жывёлы, што звязана з нізкай якасцю кармоў, а ў шэрагу сельгасарганізацый і з іх яўнай нястачай, лічыць Камітэт дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці.**

У сярэдзіне чэрвеня каля 15 тысяч кароў (амаль 10 працэнтаў ад дойнага пагалоўя) не атрымлівалі канцэнтратаў, каля 60 тысяч галоў мелі ў рацыёне толькі ад аднаго да двух кілаграмаў камбікорму ў дзень. Па стане на 18 ліпеня ў больш чым сарака гаспадарак наогул не мелася зернефуражу.

Ёсць факты, калі кармы назапасілі, а потым па сутнасці згубілі з-за неналежнага захоўвання. Напрыклад, у СВК «Цырын-Агра» Карэліцкага раёна праверкай выяўлена 728 тон сенажу, ужо непрыдатнага да скармлівання жывёле. У ААТ «Чарлёна» Мастоўскага раёна 500 тон сенажу захоўвалася ў траншэі, затопленай дажджавой вадой. Падобныя парушэнні выяўлены ў сельгаскааператывах «Дайліды» Іўеўскага, «Орля» Шчучынскага, «Міжэрычы» Зэльвенскага раёнаў. А ў саўгасе «Навадворскі» Шчучынскага раёна 725 тон сенажу, які быў непрыдатны для спажывання жывёлай, выкарысталі ў выглядзе падсцілачнага матэрыялу.

Незбалансаванасць рацыёнаў кармлення жывёлы з-за нізкай якасці нарыхтаваных кармоў і іх неналежнага захоўвання прыводзіць да непрадукцыйнага выбыцця маладняку. Не прымаюцца неабходныя меры па забеспячэнні захаванасці жывёлы. Паводле звестак камітэта Дзяржкантролю Гродзенскай вобласці, толькі за пяць месяцаў сёлета падзеж у шэрагу раёнаў павялічыўся з 4 да 36 працэнтаў. Пры гэтым у некаторых сельгаспрадпрыемствах гібель жывёлы фальсіфікуецца быццам бы яе прырэзкай. Напрыклад, у ААТ «Чарлёна» Мастоўскага раёна на ферме Глядавічы Камітэтам дзяржкантролю выяўлены трупы 74 цялят, на якія былі аформлены акты на прырэзку, а мяса ад іх быццам рэалізавана райспажыўтаварыству.

Утойванне падзяжу жывёлы ажыццяўляецца таксама і праз яе рэалізацыю нізкімі вагавымі кандыцыямі. Летась сельгаскааператывам «Дружба-Агра» Слонімскага раёна толькі перапрацоўчаму цэху Зэльвенскай спажыўкааперацыі было рэалізавана 243 галавы маладняку буйной рагатай жывёлы сярэдняй вагой 46 кілаграмаў, што складае каля 17 працэнтаў ад атрыманага прыплоду.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

Жніво-2011

### ДЗВЕ ТЫСЯЧЫ Ў «ЗАРЫ»

**Першым у Магілёўскай вобласці намалаціў 2 тысячы тон збожжа экіпаж Уладзіміра Корсака з агракамбіната "Зара" Магілёўскага раёна. Пераможцаў павіншаваў старшыня Магілёўскага аблвыканкама Пётр Руднік.**

Урачыстая цырымонія ўзнагароджання адбылася ў суботу проста на полі. Героі жніва атрымалі ганаровыя граматы і падарункі і зноў узяліся за працу. Дарэчы, Уладзімір прыехаў у Беларусь з Казахстана 9 гадоў таму, і ўвесь гэты час працуе ў агракамбінаце «Зара», адной з самых буйных і пасляховых сельскіх гаспадарак у рэгіёне. Камбайнер ужо станавіўся пераможцам рэспубліканскіх Дажынак. Летась экіпаж Корсака намалаціў больш за 4 тысячы тон, і сёлета зноў працуе на добры вынік.

**Ілона ІВАНОВА.**

Грошы

### ЗОЛАТАВАЛЮТНЫЯ РЭЗЕРВЫ ПРАКТЫЧНА НЕ ЗМЯНІЛІСЯ

Аб'ём золатавалютных рэзерваў Беларусі ў вызначэнні СCРД МВФ за ліпень практычна не змяніўся і на 1 жніўня склаў $4,15 млрд у эквіваленце. Аб гэтым паведамілі БЕЛТА ва ўпраўленні інфармацыі Нацыянальнага банка.

У нацыянальным вызначэнні ўзровень золатавалютных рэзерваў павялічыўся на $46 млн і на 1 жніўня склаў $5 млрд 696 млн у эквіваленце.

**ОТКАЗ ОТ ПРОВЕДЕНИЯ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ**

ОАО «ГУМ» извещает об отказе от проведения 12.08.2011 открытого аукциона по продаже административного здания общей площадью 286,0 кв.м, инвентарный номер 500/С-1995, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Раковская, д. 32 (извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 12.07.2011).

**Телефоны для справок: (017)226 14 45, (017)227 10 92.**





# АДЗІН ДЗЕНЬ з унутранымі войскамі МУС

Прэс-тур для вядучых рэспубліканскіх СМІ 5 жніўня правялі ўнутраныя войскі МУС. Заняткі па рукапашным баі і агнявой падрыхтоўцы, абясшкоджванне выбуханебяспечных прадметаў, паказ навыкаў пры пошуках асуджаных з удзелам спецыялістаў-кінолагаў — праграма дня была вельмі насычанай і разнастайнай. Таксама прадстаўнікі СМІ змаглі наведаць Цэнтральны музей унутраных войскаў і нават атрымаць бласлаўленне ад захавальніка палкавога храма адной з воінскіх часцей.

**Надзея БУЖАН.**

Абзац

У Мінску на мінулым тыдні 7 дырэктараў магазінаў звольнены за пустыя прылаўкі. Патрабаванне належнага функцыянавання гандлёвых аб'ектаў сталіцы выказаў на нядаўнім пасяджэнні Мінгарвыканкама яго старшыня Мікалай Ладуцька. Рэзкую рэакцыю мэра выклікалі факты паўпустых паліц у некаторых крамах горада. «Калі ёсць пустыя прылаўкі — павінен быць звольнены дырэктар магазіна», — сказаў мэр сталіцы, падкрэсліўшы, што магчымасці для запаўнення таварамі паліц магазінаў горада сёння ёсць. Факты паўпустых паліц у некаторых крамах сталіцы ён расцаніў як нежаданне працаваць кіраўніцтва гандлёвых аб'ектаў.

**Кіраўніцтва сеткі кавярняў Starbucks увяло абмежаванні на доступ кліентаў да электрычных разетак. Такім чынам кавярні будуць змагацца з наведнікамі, якія падоўгу займаюць столікі, седзячы з ноўтбукамі. Як адзначаюць прадстаўнікі Starbucks, часта бывае так: чалавек купіў каву і прожнае, а сесці яму няма дзе. Сітуацыя негатыўна адбіваецца на працы кавярняў. Рашэнне аб блакаванні разетак будзе прымацца адміністрацыяй кожнай кавярні па сітуацыі — зыходзячы з наплыву наведнікаў. У першую чаргу новаўвядзенне закране найбольш папулярныя ўстановы ў цэнтры Нью-Ёрка.**

Поўны абзац

У расійскім горадзе Пракоп'еўск Кемераўскай вобласці жанчына абрабавала 86-гадовага пенсіянера, пераапрануўшыся смерцю. У чорным адзенні і з чорнай маскай на твары яна ўварвалася да пенсіянера ў дом. Уразлівы чалавек прыняў яе за пасланніцу смерці і вельмі спужаўся. «Смерць» запатрабавала грошы і вынесла з кватэры каля 4 тыс. рублёў. Затрымалі яе хутка. Рабаўніцай аказалася судзімая раней жанчына 35 гадоў. Заведзена крымінальная справа.

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

**Футбол. Чэмпіянат Беларусі**

## Сяргей Гурэнка зноў адыграўся на «Дынама»

**У выхадныя адбыліся матчы 20-га тура чэмпіянату краіны па футболе. А распачаўся тур яшчэ ў пятніцу, калі сталічнае «Дынама» прымала жодзінскае «Тарпеда», а магілёўскі «Днепр» — салігорскі «Шахцёр».**

З таго часу, як Сяргей Гурэнка перайшоў са сталічнага «Дынама» ў жодзінскую каманду, «Тарпеда» стала, бадай, самым нязручным супернікам для бела-блакітных: чатыры разы мінская каманда саступала жодзінцам. У «Дынама» ўсё апошнім часам складвалася нядрэнна, і трэці турнірны радок, за які сёлета і будзе весціся асноўная бітва, ім скарыўся. Але прыезд «Тарпеда-БелАЗ» у Кунцаўшчыну зноў скончыўся нядобра для бела-блакітнай тарсіды. Гол на 88-й хвіліне — і трэці радок «Дынама» пакуль прыйшлося саступіць, прапусціўшы наперад якраз жодзінцаў.

А вось «Шахцёр» куды больш стабільна заснаваўся на другім месцы — трынаццаць тураў салігорская каманда не ведае паражэнняў. Апошні не стаў выключэннем — адзіны гол у вароты «Дняпра» на 53-й хвіліне забіў Камароўскі. У «Дняпра» зноў пачалася паласа няўдач — восем тураў каманда не адчувала смаку перамог і замацавалася на апошнім турнірным радку.

Нягледзячы на стабільнасць, дагнаць БАТЭ «Шахцёру» пакуль не ўдаецца. Лідар сезона з такім жа папулярным у туры лікам 1:0 у нядзелю перайграў «Белшыну». На 74-й хвіліне гол забіў Арцём Канцавы.

Яшчэ два матчы прайшлі ў суботу. Брэсцкае «Дынама», саступаючы два мячы, атрымала валявую перамогу над «Нёманам» — 3:2. «Нафтан» і «Віцебск» разышліся ўнічыю — 1:1.

Становішча камандаў: БАТЭ — 47 ачкоў (розніца мячоў 36-8), «Шахцёр» — 39 (26-11), «Нафтан» — 28 (28-28), «Тарпеда-БелАЗ» — 28 (22-24), «Дынама» (Мн) — 27 (23-22), «Гомель» — 25 (20-13), «Белшына» — 24 (24-25), «Віцебск» — 22 (17-25), «Нёман» — 22 (20-29), «Мінск» — 21 (22-26), «Дынама» (Бр) — 19 (23-33), «Днепр» — 15 (17-34).

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

## ДАІ ЗНАЙШЛА КІРОЎЦУ, ЯКІ НАСМЕРЦЬ ЗБІЎ ПЕШАХОДА

7 жніўня ў Мінску каля 23 гадзін 45 хвілін невядомы кіроўца на неўстаноўленым аўтамабілі (мяркуецца, што гэта «БМВ» 5-й серыі) без рэгістрацыйных знакаў здзейсніў наезд на пешахода-мужчыну 1983 г.н., які пераходзіў вуліцу на зялёны сігнал святлафора. Ад атрыманых цялесных пашкоджанняў пешаход загінуў на месцы. Здарэнне адбылося на вуліцы Прытыцкага (аўтамабіль рухаўся з боку вуліцы Ляшчынскага ў кірунку вуліцы Лабанка) насупраць дома № 72.

Як паведамілі ўчора ў ДАІ Мінгарвыканкама, у выніку аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў кіроўца быў знойдзены. Ім аказаўся 22-гадовы мужчына, які прызнаўся ў здзейсненым.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

**Заўтра наша зборная праверыць сілы перад фінішам кваліфікацыі**

Бернд ШТАНГЕ:

# «ГУЛЬНІ З БАЛГАРЫЯЙ І БОСНІЯЙ — ГЭТА ЯК ДЗВЕ РОЗНЫЯ ПАРЫ ЧАРАВІКАЎ»

**10 жніўня на галоўным стадыёне ў Мінску нацыянальная зборная па футболе сустрэнецца з балгарамі. Матч таварыскі, і, нягледзячы на тое, што ў рэкламным роліку Бернд Штангє, заклікаючы балельшчыкаў на «Дынама», заяўляе, што гульня будзе рэпетыцыяй перад Босніяй, паядынак не будзе падобны на афіцыйныя сустрэчы. Нагадаем, што ў пачатку верасня нам завяршаць кваліфікацыю: два матчы мы правядзём супраць баснійцаў, і ад іх вынікаў будзе залежаць, ці трапіць беларуская зборная на Еўра-2012, фінал якога будзе праходзіць зусім побач, у Польшчы і ва Украіне.**

Але пэўнай трэніроўкай перад фінішам кваліфікацыі гульню з Балгарыяй можна лічыць. Бернд Штанге праверыць абноўлены склад, які апошнім часам вымушаны замяніць футбалістаў, што выбылі па тых ці іншых прычынах. Так, у зборную выкліканыя тры навічкі з нашай моладзевай зборнай-трыумфатара сёлетняга Еўра — Стас Драгун, Павел Няхайчык і Аляксандр Гутар.

— Колькасць гульцоў у нашай камандзе, якія гулялі на моладзевым Еўра-2011, дасягне 10 чалавек. Гэта вельмі здаровая структура, на якую мы можам спадзявацца ў будучыні, — распавёў Бернд Штанге. — Мы дадалі імпульсіўных маладых гульцоў. Стас — футбаліст з добрымі характарыстыкамі, які можа выйграваць. Нам патрэбны такі футбаліст, які з дапамогай індывідуальных якасцяў можа выратаваць матч, калі гульня «завісае». Няхайчык — вельмі небяспечны гулец для варот суперніка, ён забівае шмат галоў.

Але пастаянны кадравы галаўны боль галоўнага трэнера — нападаючыя.

— У нас у камандзе 2 нападаючых — Карнілёнка і Варанкоў. І абодва не гуляюць у клубах. Варанкоў правёў выдатныя гульні на чэмпіянаце Еўропы, але некаторыя трэнеры ва Украіне не да канца давяраюць маладым гульцам. Я вельмі спадзяюся, што Радзівонаў, які аднавіўся пасля траўмы, прыйдзе ў каманду. Аляксандр Глеб дакладна ў гэтым сезоне не зможа згуляць пасля траўмы. Кутузаў, калі не пачне гуляць, таксама не мае ніякіх шанцаў, — растлумачыў Штангє.

Яшчэ адна праблема — газон стадыёна «Дынама».

— Мы збіраемся прадэманстраваць добры камбінацыйны футбол, калі дазволіць не вельмі якаснае пакрыццё стадыёна «Дынама». Я расчараваны якасцю поля на стадыёне, які з'яўляецца «тварам» краіны. Трэнер аўстрыйскага «Штурма» спадар Фода, які 16 жніўня гуляе з БАТЭ ў Лізе чэмпіёнаў і ў выхадныя пабываў у Беларусі, таксама застаўся незадаволеным газонам і напісаў нават пісьмовую скаргу, — пажаліўся галоўны трэнер.

Матч з балгарамі не будзе падобным на гульню супраць баснійцаў, бо зборныя зусім розныя.

— Гэта як дзве розныя пары чаравікаў, — вобразна параўнаў каманды Бернд. — Нельга імітаваць Боснію на балгарскім прыкладзе. З баснійцамі будзе гульня нерваў, дзе шмат вырашае стабільнасць футбалістаў. Мы можам казаць, што гэта генеральная рэпетыцыя, але гульцы так не думаюць. Мы не маем права траўмавацца, бо 16 жніўня БАТЭ гуляе матч, які каштуе мільёны. Матч з балгарамі — гэта проста тэст для сябе, дзе кожны з футбалістаў стукае ў дзверы і кажа: «Я хачу гуляць супраць Босніі».

А напрыканцы галоўны трэнер падвёў вынік выступлення клубаў у еўракубках, а таксама паразважаў аб прагрэсе зборнай:

— Я не расчараваны вынікамі еўракубкаў. Я чакаў і прадказваў публічна менавіта такое выступленне. Ва ўсіх клубаў, акрамя аднаго, які мы ўсе ведаем, не хапае запасу трываласці, каб вытрымаць міжнародны ўзровень. Калі так будзе і далей, нам прыйдзецца складана. Ёсць трэнеры, якія імкнуцца нешта змяніць, але ў клубаў пакуль ёсць пэўны ліміт.

У той жа час Бернд Штанге не мог не засяродзіць увагу і на поспехах нашай каманды:

— У міжнародным рэйтынгу мы шмат камандаў пакінулі ззаду — Балгарыю, Шатландыю, Румынію, Польшчу. І сталі на адну прыступку са зборнымі Украіны, Бельгіі, Чэхіі. Мы ганарымся гэтым, але гэта трэба пастаянна пацвярджаць і даказваць, што мы мацней за Аўстрыю, Румынію, Балгарыю.

Будзем спадзявацца, што нашым маладым гульцам па плячы гэтая задача. А ўсе ахвотныя могуць падтрымаць іх заўтра на стадыёне «Дынама». Матч пачнецца ў 20 гадзін.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

# НАША СІЛА — ВЕРА Ў СЯБЕ

**У сераду нацыянальная футбольная зборная правядзе таварыскі матч з камандай Балгарыі. Гэта будзе апошні падрыхтоўчы паядынак перад самымі адказнымі гульнямі восені, якія дадуць адказ: паедуць беларусы на Еўра-2012, ці лепшых часоў яшчэ давядзецца пачакаць...**

**Як вядома, нядаўна ў Бразіліі адбылася жараб'ёўка чэмпіянату свету 2014 года. Усе лічаць, што для нашай зборнай яна склалася не вельмі ўдала. Мяркуйце самі: у кампаніі з намі будуць гуляць такія дружыны, як Францыя і Іспанія. Нельга забываць і пра Грузію з Фінляндыяй (гэта — зусім не Люксембург). Сваімі думкамі наконт шанцаў беларусаў падзяліліся вядомыя беларускія футбалісты.**

**Дзмітрый МОЛАШ** (паўабаронца, «Крылы Саветаў», Расія):

— Нам дасталіся сур'ёзныя сапернікі. Гэта і пераможца мінулага чэмпіянату Еўропы — Іспанія, і магутная Францыя. Нельга забываць і Фінляндыю з Грузіяй. Яны таксама моцныя. Шанцы прайсці, вядома, ёсць. Да 2014 года яшчэ шмат чаго можа змяніцца...

**Мікіта БУКАТКІН** (паўабаронца, «Нафтан»):

— Гэта самая цяжкая група, калі параўноўваць з усімі мінулымі жараб'ёўкамі. Хацелася б атрымаць больш лёгкіх сапернікаў, але... Пра Іспанію і Францыю можна нічога не казаць, таму што ўсе і так ведаюць іх моц. Фіны таксама вельмі добрая каманда. Грузія ў апошнія гады выступае вельмі някепска. Застаецца спадзявацца, што ўсё будзе добра.

**Максім ВАЛАДЗЬКО** (паўабаронца, БАТЭ):

— Група неверагодна цяжкая. Але ў тым, што давядзецца гуляць з такімі моцнымі зборнымі, ёсць і станоўчы бок. З іспанцамі будзе складана цягацца. Гэта відавочна. Напэўна, дабіцца выніку можна будзе за кошт хуткіх контратак. З Францыяй ужо гулялі. Усе памятаюць, як — узялі ў іх 4 ачкі з 6-ці магчымых. Ну, а з астатнімі трэба проста гуляць у сваю сілу і перамагаць.

**Алег ВЕРАЦІЛА** (абаронца, «Дынама Мінск»):

— З аднаго боку, нам з лёсаваннем, безумоўна, не пашанцавала. З другога — мы будзем мерацца сілай з чэмпіёнамі свету! Калі такое яшчэ будзе?! Супернікі моцныя, але шанцы ёсць, і наша зборная гэта ўжо даказвала. Выніку можна дабіцца за кошт самаааддачы і канцэнтрацыі ўвагі.

**Віталь РАДЗІВОНАЎ** (нападаючы, БАТЭ):

— Будзем аптымістамі: мне жараб'ёўка спадабалася. Калі пачуў, з кім прыйдзецца гуляць, быў вельмі рады. Не разумею некаторых гульцоў з нашай зборнай, якія кажуць, што ў нас няма ніякіх шанцаў. Трэба выходзіць з думкамі аб тым, як можна дабіцца добрага для нас выніку. Нам пашанцавала гуляць з такімі зборнымі, як Францыя і Іспанія. Гэта будзе праверка моцы нашай каманды. Галоўнае — верыць у сябе.

**Падрыхтаваў Максім СТАЯН.**

# МОЦНЫЯ Ў ВЕРЫ

**Не інакш як «беларускім Мадрыдам» ахрысцілі Івянец у мінулыя выхадныя. З пятага па сёмага жніўня ў гэтым мястэчку праходзіла II Усебеларуская малітоўная сустрэча моладзі. У гэтыя дні сюды прыбыло некалькі соцень маладых людзей з усіх епархій краіны. Сустрэча была прымеркаваная да Сусветнага дня моладзі з удзелам Папы Рымскага, які пройдзе ў сярэдзіне жніўня ў Мадрыдзе.**



...Субота. На гадзінніку 21.00, а людзі працягваюць прыбываць — намётавы гарадок расце як на дражджах. Жнівеньскія вечары халаднаватыя, але гэта не спыняла моладзь. Прыбываючы з розных куткоў краіны, яны сведчаць — вера ў Беларусі жывая. І хоць сёння Івянец называюць беларускім Мадрыдам, не выключана, што калі-небудзь будзе наадварот — і моладзь з усяго свету збярэцца ўжо ў Беларусі — засведчыць веру на беларускай зямлі.

— Ідэя правядзення такіх сустрэч узнікла ў 2008 годзе, калі Сусветная сустрэча моладзі з Папам Рымскім павінна была адбыцца ў Сіднеі, — расказаў "Звяздзе" **пробашч прыхода Міхала Арханёла ў Івянцы айцец Лех БАХАНЭК.** — Паколькі тады паляцець у Аўстралію атрымалася не ва ўсіх, мы вырашылі зладзіць лакальную сустрэчу ў беларускім фармаце. Месцам правядзення Беларускай сустрэчы моладзі былі выбраны Івянец. Пазней такія сустрэчы было вырашана зрабіць традыцыйнай.

Праграма малітоўнай сустрэчы, акрамя канферэнцый і ўдзелу ў набажэнствах, уключала таксама і «круглыя сталы» на актуальныя тэмы — дабрачыннасць і валантарыят, прызванне да Божагаслужэння, хрысціянская сям'я, псіхалогія маладога чалавека, прафілактыка акультызму, Царква і СМІ і інш.

Адмысловыя прэзентацыі сваіх епархій рыхтавала і сама моладзь. Прадстаўнікі грэка-каталіцкай Царквы распавялі гісторыю сваёй Царквы ў гістарычным кантэксце. Асаблівая ўвага была ўдзелена абразу Маці Божай Жыровіцкай і яго ролі ў гісторыі Царквы Беларусі.

Семінарысты вышэйшай духоўнай семінарыі імя святога Тамаша Аквінскага прывезлі фільм пра 10-годдзе аднаўлення духоўнай семінарыі ў Пінску. 25-хвілінны фільм распавёў пра фармацыю святароў — перыяд ад паступлення юнака ў семінарыю да пасвячэння яго ў святары.



Тэмай малітоўнай сустрэчы сталі радкі са Святога Пісання — «укаранёныя і збудаваныя ў Хрысце, моцныя ў веры». Сімвал «укаранёнасці» асабліва яскрава прасочваўся падчас урачыстай цырымоніі пасадкі маладога дрэва, якое здзейсніў мітрапаліт Тадэвуш Кандрусевіч.

— Вера — гэта вялікі скарб, і яна павінна быць своечасова ўмацоўвацца, узрастаць і перамагаць цяжкасці, — зазначыў у сваім звароце падчас службы **мітрапаліт Мінска-магілёўскі Тадэвуш КАНДРУСЕВІЧ, Апостальскі адміністратар Пінскай епархіі.** — Калі яна не будзе ўзрастаць, то пачне змяншацца. Чалавек, які не клапоціцца пра веру, больш увагі надзяляючы матэрыяльным справам, утопіцца ў жыцці, якое, як мора падчас шторму, толькі і чакае, каго б прыняць у сваю глыбіню.

— Слова «ўкаранёныя» ў пэўным сэнсе адносіцца да нашай веры, духоўнасці, якія павінны мець моцныя карані, — распавёў **ксёндз з Мінска Віталь ДРАЗДОЎСКІ.** — Іх на першы погляд не відаць, гэтаксама як не відаць і каранёў дрэва. Але без іх дрэва не можа існаваць. Таксама і ў духоўным жыцці — каранёў не бачна, але калі яны ў Хрысце, вера і духоўнасць развіваюцца.

**Ільля ЛАПАТО.**
**Фота Аляксандры ШЧЫГЛІНСКАЙ.**
*Івянец—Мінск.*

**Даведка «Звязды»:**

**Сусветныя дні моладзі — традыцыйныя спатканні хрысціянскай моладзі свету з Папам Рымскім. Праходзяць раз на тры гады. Упершыню падобная сустрэча адбылася ў Рыме ў 1986 годзе, тады ў сустрэчы прыняло ўдзел каля 350 тысяч маладых людзей з 70 краін свету.**

**Ініцыятарам правядзення такіх дзён быў Ян Павел ІІ, які прапанаваў праводзіць спатканні традыцыйна. Самымі ж масавымі сталі дні моладзі ў Маніле ў 1995 годзе, у якіх удзельнічала амаль 5 млн чалавек. Сёлета Сусветныя дні моладзі пройдуць у Мадрыдзе. Наступнае спатканне збярэ моладзь у Рыа-дэ-Жанейра ў 2013 годзе.**

**Лета дабрачыннае**

## АДПАЧЫЦЬ АД... ЛЯЧЭННЯ

**Да 17 жніўня ў Міжнародным дзіцячым рэабілітацыйна-аздараўленчым цэнтры «Надзея — XXI стагоддзе», што ў Вілейскім раёне, працягвае адпачываць 40 дзяцей, якія перанеслі аперацыі на сэрцы. Вось ужо шосты раз Беларускі дзіцячы фонд праводзіць адзіную ў краіне дабрачынную аздараўленчую змену для дзяцей з сардэчнымі захворваннямі «Вясёлыя сэрцайкі».**

Большую частку жыцця дзеці з цяжкімі парокамі сэрца праводзяць у бальнічных палатах — праходзяць штогадовыя абследаванні, лячэнне, аперацыі. Як правіла, у такіх дзяцей вельмі абмежаваныя фізічныя нагрузкі, мала сяброў. Змена «Вясёлыя сэрцайкі» дазваляе адпачыць на свежым паветры, прайсці курс псіхалагічнай рэабілітацыі. Псіхолагі дапамагаюць аслабіць пачуццё трывогі, павысіць камунікатыўныя навыкі, знайсці новыя інтарэсы. Прапануюцца, вядома, і аздараўленчыя працэдуры — сеансы спелеа-, фіта- і водарнай тэрапіі, прыём вітамінаў, заняткі дыхальнай гімнастыкай. Для кожнага дзіцяці з улікам узросту і цяжкасці захворвання распрацоўваецца спартыўная праграма — пешыя прагулкі, велапрагулкі, катанне на водных веласіпедах, заняткі ў трэнажорнай зале.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

# Краіна здароўя

Выпуск
№ 45 (281)


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## Доктар адкажа

**Ёсць пытанні? Тэлефануйце...**
**На бягучым тыдні дзяжурыць на «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць:**

**9 жніўня** — галоўны ўрач 32-й мінскай гарадской паліклінікі Валянціна Мікалаеўна ЧУПІК.

**10 жніўня** — галоўны ўрач 11-й дзіцячай паліклінікі горада Мінска Людміла Паўлаўна ЛАЗУТА.

**11 жніўня** — галоўны ўрач 13-й дзіцячай паліклінікі горада Мінска Наталля Васільеўна ГАГАНАВА.

**12 жніўня** — галоўны ўрач 22-й дзіцячай паліклінікі горада Мінска Інэса Вячаславаўна САФРОНАВА.


## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества | **Лот № 1. УРАЛ 43202 гос. № АВ 3257-5, 1988 года выпуска, темно-зеленого цвета, номер кузова ХТР43202060100533, с гидроманипулятором марки ATLAS AN3510A номер установки 277.** |
| Собственник (владелец) имущества | **ИП «Истондрев»** |
| Местонахождение (адрес) имущества | **г.п. Боровуха, ул. Армейская, 74** |
| Стоимость имущества | **Лот № 1 – 50 080 800 белорусских рублей (с учетом НДС)** |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | **г. Витебск, ул. Правды, 32, каб. 321 09 сентября 2011 года в 15.00** |
| Справочная информация об организаторе торгов | Хозяйственный суд Витебской области. 210101, г. Витебск, ул. Правды, д. 32, каб. 321, http:// vitebsk.court.by/ Судебный исполнитель Зуев Михаил Евгеньевич тел./факс. (80212) 49 13 43, (8 044) 734 93 00, старший судебный исполнитель Бородулин Алексей Александрович, тел. (80212) 49 13 40; (8044) 746 73 00 |
| Условия и порядок проведения торгов | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано: 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903000023 в 201 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Витебск, код 259, УНН 300007670, **не позднее 15 ч. 00 м. 09.09.2011 г.** Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества | **Лот № 1. Капитальное строение (здание магазина) с инвентарным номером 212/С-1048 общей площадью 354,4 м.кв.** |
| Собственник (владелец) имущества | **Индивидуальный предприниматель Кирилов Михаил Терентьевич** |
| Местонахождение (адрес) имущества | **г.п. Шарковщина, ул. Краснодворская, 68** |
| Стоимость имущества | **Лот № 1 – 501 600 000 белорусских рублей (с учетом НДС)** |
| Место (адрес), дата и время проведения торгов | **г.п. Шарковщина, ул. Краснодворская, 68. 24 августа 2011 года в 11.00** |
| Справочная информация об организаторе торгов | Хозяйственный суд Витебской области. 210101, г. Витебск, ул. Правды, д. 32, каб. 321, http:// vitebsk.court.by/ Судебный исполнитель Зуев Михаил Евгеньевич тел./факс. (80212) 49 13 43, (8 044) 734 93 00, старший судебный исполнитель Бородулин Алексей Александрович тел. (80212) 49 13 40; (8044) 746 73 00 |
| Условия и порядок проведения торгов | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано: 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903000023 в 201 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Витебск, код 259, УНН 300007670, **не позднее 11 ч. 00 м. 24.08.2011 г.** Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |


Лечымся без лекаў

# ЖНІВЕНЬ СУПРАЦЬ РАНАК І ГІПЕРТАНІІ

**Да гэтага часу мы ў асноўным займаліся нарыхтоўкай лісця, сцёблаў і каранёў гаючых раслін. У жніўні варта звярнуць увагу на кветкі, паколькі многія з іх з'яўляюцца не толькі крыніцай эстэтычнага задавальнення, але і эфектыўным лекавым сродкам.**

Вось, напрыклад, усім вядомая **календула (наготкі)**. Спектр яе дзеяння вельмі шырокі — неўрозы, стэнакардыя, гіпертанія, атэрасклероз, захворванні страўніка, нырак, селязёнкі, жоўцевых шляхоў. Для пазбаўлення ад гэтых немачаў прымяняюць настой расліны: 2 ст. лыжкі сухіх кветкавых кошыкаў заліць 2 шклянкамі кіпеню і настойваць у тэрмасе не менш як 30 хвілін. Прымаць па паўшклянкі 3—4 разы на дзень да яды.

Пры трафічных язвах, ранках, эрозіях, апёках, для паласкання поласці рота і горла пры стаматыце і ангіне настой з кветкавых кошыкаў прымяняецца вонкава. Пры гэтым для яго прыгатавання бярэцца 4 ст. лыжкі высушаных кветак на 2 шклянкі вады.

Калі на пятках з'явіліся трэшчыны і ранкі, рэгулярна перад сном на працягу 10—15 хвілін рабіце цёплыя ванначкі для ног з настоем наготак (1 ст. лыжка на літр вады). Зрэшты, такія працэдуры можна выконваць і з прафілактычнай мэтай.

Календула дапамагае змагацца з аблысеннем. Для прадухілення выпадзення валасоў у скуру галавы варта рэгулярна ўціраць мазь са здробненых сухіх кветак, змяшаных з натуральным сметанковым маслам. Свежы сок расліны традыцыйна выкарыстоўваецца для догляду скуры твару, напрыклад, для барацьбы з рабаціннем.

Сокам календулы змазваюць месцы ўкусаў восаў і пчол. Пры дыятэзе ў дзяцей робяць прымочкі з настою кветак: заліць 10 г сухой сыравіны 100 г кіпеню, настойваць 1—2 гадзіны і працадзіць.

Агульнаўмацавальнае дзеянне на арганізм аказвае гарбата з наготак (1 ч. лыжка сухіх кветак на шклянку кіпеню). Асабліва яна карысная пажылым людзям і аслабленым дзецям, якія часта хварэюць. Толькі памятайце: лепш за ўсё збіраць кветкі наготак, якія маюць найбольш інтэнсіўную афарбоўку (у ярка афарбаваных кветках караціну больш, чым у бледных).

Яшчэ адна даступная расліна, пра карысныя ўласцівасці якой вы зараз даведаецеся, — **ваўчкі трохраздзельныя**. У першую чаргу ваўчкі вядомыя як «ванная расліна». Іх дадаюць у ванны пры лячэнні розных захворванняў скуры, такіх як алергія, дыятэз, крапіўніца. І расліна гэта павінна быць добра знаёмай мамам, у якіх дзеці пакутуюць ад скурных захворванняў. Ванны з настоем ваўчкоў і прыгатаваныя на іх аснове мазі з'яўляюцца выдатным супрацьзапаленчым сродкам пры ўкусах камароў, ядавітых насякомых і змей. Таму ўлетку ваўчкі заўсёды павінны быць у вас пад рукой.

● Для прыгатавання настою бяруць 15 грам сушанай расліны (прыкладна 2 ст. лыжкі), заліваюць шклянкай вады пакаёвай тэмпературы і падаграваюць на вадзяной лазні (даводзіць да кіпення сумесь не трэба, бо гэта разбурыць карысныя рэчывы, што змяшчаюцца ў ваўчках). Затым настойваюць на працягу 45 хвілін, працэджваюць і даводзяць да першапачатковага аб'ёму гатаванай вадой. Прымаюць настой па 1 ст. лыжцы 3—4 разы на дзень. Такі настой зніжае артэрыяльны ціск, паляпшае апетыт і страваванне, аказвае заспакаяльнае дзеянне.

**Увага!** Празмернае ўжыванне прэпаратаў з ваўчкоў выклікае павышаную нервовую ўзбуджальнасць, парушае функцыю сну.

Высушаныя **кветкі піжмы**, нарыхтаваныя ў жніўні, спатрэбяцца тым, хто пакутуе ад нервовых захворванняў, эпілепсіі, сухотаў, гастрытаў з паніжанай кіслотнасцю страўнікавага соку, язвавай хваробы, захворванняў печані і жоўцевага пузыра.

Вонкава выкарыстоўваецца настой і адвар з кветак піжмы для ваннаў і кампрэсаў пры вугрыстым сыпе, фурункулёзе, запаленні суставаў, падагры.

Дарэчы, піжма валодае інсектыцыднымі ўласцівасцямі і прымяняецца для барацьбы з моллю, мухамі, прусакамі і інш. Для гэтага гатуюць канцэнтраваны адвар з кветак піжмы, перад выкарыстаннем яго змешваюць з цукрам і ставяць у месцах збірання насякомых.

● Для прыгатавання адвару піжмы трэба ўзяць 2 ст. лыжкі сухой здробненай сыравіны, заліць 0,5 л кіпеню, варыць на слабым агні 10 хвілін, настойваць паўгадзіны—гадзіну. Прымаць па 1/4—1/3 шклянкі 3 разы на дзень за 20—30 хвілін да яды.

● Настой піжмы гатуецца ў тых жа суадносінах. Прымаецца ён звычайна па 1/4—1/3 шклянкі 3 разы на дзень. Пры язвавай хваробе страўніка доза настою і адвару можа быць павышана да 1/2 шклянкі на прыём.

● Пры рэўматызме карысна ўжываць віно з піжмы: 50 г суквеццяў заліваюць бутэлькай мускатнага віна, настойваюць 8 дзён і п'юць па 30—40 мл пасля яды 2 разы на дзень.

**Увага!** Прэпараты піжмы супрацьпаказаны пры цяжарнасці і дзецям малодшага ўзросту.

Не праходзьце і міма палыну. Збіраць яго трэба ў пачатку цвіцення, зрываючы толькі квітнеючыя верхавінкі не даўжэйшыя за 25 см. **Палын** стымулюе дзейнасць стрававальных залоз, павышае апетыт, актывізуе ахоўныя сілы арганізма, з'яўляецца эфектыўным гарачкапаніжальным і адхарквальным сродкам. Яго рэкамендуецца ўжываць пры ліхаманцы, грыпе, захворваннях печані, жоўцевага пузыра, анеміі, бессані, метэарызме, гемароі, болі ў суставах. Калі пажаваць палын, то можна хутка пазбавіцца ад непрыемнага паху з рота.

● Спосаб прыгатавання настою: 10 г сыравіны (2 ст. лыжкі) заліць 200 мл гатаванай вады, награвaць у эмаляваным посудзе на вадзяной лазні пры закрытай накрыўцы на працягу 15 хвілін, затым даць пастаяць 45 хвілін, працадзіць. Сыравіну адціснуць, а аб'ём атрыманага настою давесці гатаванай вадой да 200 мл. Прыгатаваны настой захоўваць у халаднаватым месцы не больш як 2 сутак. Прымаць па 1/4 шклянкі 3 разы на дзень за 30 хвілін да яды.

**Увага!** Працяглае ўжыванне прэпаратаў палыну можа выклікаць атручэнне. Таму паміж курсамі прыёму палыну варта рабіць перапынкі да 2 месяцаў. Нельга злоўжываць палыном пры малакроўі. Супрацьпаказаны прэпараты палыну пры цяжарнасці.



Калі пачнуць спець кукурузныя катахі, можна збіраць **кукурузныя рыльцы** (лічыцца, што калі катах набыў малочна-васковую спеласць — самы час для збору рыльцаў.)

Лекавая каштоўнасць кукурузных рыльцаў абумоўліваецца наяўнасцю ў іх вітаміну К, аскарбінавай і пантатэнавай кіслот, горкіх гліказідаў, эфірнага алею, смалістых і цукрыстых рэчываў, танінаў, камедзі і іншых карысных складнікаў. Такі ўнікальны набор дазваляе эфектыўна прымяняць кукурузныя рыльцы ў якасці жаўцягоннага, мачагоннага і кровaспыняльнага сродку. Вялікая колькасць вітаміну К садзейнічае паляпшэнню згусанню крыві. Валодаючы моцнымі мачагоннымі ўласцівасцямі, кукурузныя рыльцы дапамагаюць змагацца з ацёкамі, асабліва застойнага характару. Прэпараты з кукурузных рыльцаў павялічваюць выпрацоўку жоўці, робяць яе менш вязкай і паляпшаюць яе вывядзенне.

● Для прыгатавання адвару 1 ч. лыжку здробненай сыравіны заліць 1/2 шклянкамі гарачай вады, кіпяціць у закрытым посудзе на вадзяной лазні 30 хвілін, ахалоджваць 45 хвілін, працадзіць, давесці аб'ём гатаванай вадой да першапачатковага. Прымаць па 1—3 ст. лыжкі 3 разы на дзень за 20 хвілін да яды.

● Настой: 1 ч. лыжку здробненых рыльцаў заліць 1 шклянкай кіпеню, настойваць 20 хвілін, працадзіць праз 2—3 столкі марлі. Прымаць па 2—3 ст. лыжкі 3—4 разы на дзень за 20 хвілін да яды.

Пастарайцеся, каб у вашай хатняй аптэчцы была і **канюшына лугавая** (чырвоная). Кветкі, лісце канюшыны ў свежым або сухім выглядзе пажадана дадаваць ва ўсе травяныя зборы, гарбату, паколькі гэтая расліна садзейнічае аднаўленню сіл пасля працяглых нагрузак.

Чырвоная канюшына забяспечвае дэтаксікацыю печані і арганізма ў цэлым, добра ачышчаючы кроў і лімфу; паляпшае адток жоўці, нармалізуе дзейнасць страўніка; аслабляе сімптомы менапаўзы, паколькі ўключае некаторыя рэчывы (ізафлавоны і іншыя флаваноіды), якія дзейнічаюць падобна да эстрагену.

Народныя лекары адзначаюць яшчэ адну ўласцівасць канюшыны — яна цудоўна можа замяніць хімічны прэпарат аспірын.

Спосаб прыгатавання: заварыць 1 ст. лыжку сухіх галовак шклянкай кіпеню. Настойваць 35—40 хвілін, у настой можна дадаць 1 ч. лыжку мёду. Піць па 0,5 шклянкі сумесі праз 15 хвілін пасля яды некалькі разоў на дзень.

Настоем суквеццяў прамываюць запаленыя вочы і выкарыстоўваюць яго ў выглядзе прымочак пры ранах, апёках, пухлінах, залатусе. Спосаб прыгатавання: 2 ч. лыжкі кветак на 1 шклянку кіпеню. Настойваць 5—6 гадзін, лепш за ўсё ў тэрмасе.

**Увага!** Перад тым, як пачаць ужываць прэпараты з лекавых раслін, абавязкова парайцеся са сваім урачом.

**Падрыхтавала**
**Вольга КУЛІНКОВІЧ.**

# МІНУС 13,3 ТЫСЯЧЫ

**У параўнанні з пачаткам года колькасць насельніцтва Беларусі скарацілася на 13,3 тысячы чалавек і склала 9 467,9 тысячы. Скарачэнне колькасці насельніцтва абумоўлена перавышэннем колькасці памерлых над колькасцю народжаных на 18 667 чалавек.**

Паводле інфармацыі Нацыянальнага статыстычнага камітэта Рэспублікі Беларусь, за першае паўгоддзе ў краіне нарадзілася 50 801 чалавек, што на 2 100 дзяцей менш, чым за адпаведны перыяд летась, а памерла 69 468 чалавек, што на 822 больш. Самая вялікая колькасць народжаных назіраецца ў Мінску, а памерлых — у Мінскай і Гомельскай абласцях. Міграцыйны прырост складае сёння 5 390 чалавек (у рэспубліку прыбыла 8 378 чалавек і выбыла 2 988).

У першай палове года ў параўнанні з адпаведным перыядам мінулага колькасць зарэгістраваных шлюбаў вырасла на 11 працэнтаў, колькасць разводаў — на 9,5. Такім чынам, сёлета на 1 000 зарэгістраваных шлюбаў прыпадалі 584 разводы (летась было 593).

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## ОАО «Амкодор-Унимод», 220073, г. Минск, ул. Пинская, 18

**ИЗВЕЩЕНИЕ О СОЗЫВЕ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ**

Собрание состоится 22 августа 2011 г. в 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Пинская, 18, актовый зал Общества. Регистрация участников собрания производится в день и по месту проведения собрания с 15.00 до 15.45.

Дата составления списка акционеров, имеющих право на участие в Собрании, — 8 августа 2011 г.

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

**1.** О получении кредита на сумму 2 146 637 Евро.

**2.** О заключении договора на открытие аккредитива с ОАО «БПС-Банк».

**3.** О передаче в залог имущества Общества и заключении договоров залога с ОАО «БПС-Банк».

**4.** Об утверждении стоимости имущества, передаваемого в залог.

**5.** О полномочиях директора Общества по заключению, изменению и исполнению указанной сделки с ОАО «БПС-Банк».

Основание созыва собрания — решение Совета директоров Общества от 8 августа 2011 года.

С информацией (материалами), подлежащими предоставлению акционерам при подготовке к проведению собрания, акционеры могут ознакомиться ежедневно (кроме субботы и воскресенья), начиная с 15 августа 2011 г. в отделе кадров Общества с 9.00 до 16.00, а в день проведения собрания — по месту его проведения.

Участникам собрания при себе иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера — доверенность или договор).

Совет директоров ОАО «Амкодор-Унимод».

УНП 100010116

**Утерянные бланки строгой отчетности** «Договор страхования, заключаемый по добровольному страхованию имущества граждан» серии БИ №8725088, 8725091 в количестве 2 шт. представительства Белгосстраха по Червенскому району **считать недействительными**. УНП 600013344

## «ПЕРАБЛЫТАЛА»

У Віцебску па дапамогу ў міліцыю звярнулася жанчына, якая паведаміла, што раніцай нехта ў краме скраў яе туфлі з камеры захоўвання, падабраўшы ключ. Міліцыянеры дэпартамента «Аховы» па гарачых слядах затрымалі... 70-гадовую пенсіянерку, якая і «пераблытала» камеры. Заведзена крымінальная справа. А ў папулярным гандлёвым цэнтры «Эвіком» супрацоўнікі міліцыі затрымалі двух жанчын, якія прыхапілі з вітрыны гандлёвага павільёна сарафаны. Без аплаты, вядома.

## СТУДЭНТ СКРАЎ МІЛЬЁНЫ

У Віцебску ля пункта абмену валюты на Смаленскім рынку ў жанчыны з сумачкі скралі 3,3 мільёна рублёў і мабільны тэлефон. Адбылося гэта а першай гадзіне дня. Міліцыянеры высветлілі, што на злачынства пайшоў 23-гадовы студэнт. Заведзена крымінальная справа.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## Уважаемые акционеры ОАО «Техноприбор»!

**19 августа 2011 года**

**СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «Техноприбор», расположенного по адресу: г. Могилев, ул. Гришина, 96.**

***Собрание пройдет по адресу: г. Могилев, ул. Гришина, 96, здание столовой ОАО «Техноприбор».***

**Повестка дня:**

О вхождении ОАО «Техноприбор» в состав Производственного объединения «Белорусский металлургический завод».

**С материалами, подготовленными к внеочередному собранию, можно ознакомиться по адресу:** г. Могилев, ул. Гришина, 96 (центральная проходная) с 15 по 18 августа 2011 года (в рабочие дни с 8.00 до 16.00) либо 19 августа 2011 года по месту проведения собрания.

Регистрация участников внеочередного собрания: **с 14.00 до 15 часов 20 минут** по месту проведения внеочередного собрания на основании документа, удостоверяющего личность. Представитель акционера должен иметь доверенность, зарегистрированную в установленном порядке.

**Начало работы внеочередного собрания: 19 августа 2011 года в 15 часов 40 минут.**

Список акционеров для участия во внеочередном собрании будет составлен по состоянию реестра на 5 августа 2011 года.

**Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.**

*Наблюдательный совет.*

*26 22 71.*

УНП 700099501.

## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества** | **Лот № 1. Капитальное строение с инвентарным номером 200/С-76682, назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – открытый склад строительных материалов.** |
| **Собственник (владелец) имущества** | **КУП ПСП «Витебскоблсельстрой»** |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | **г. Витебск, пр. Московский, 55ж** |
| **Стоимость имущества** | **Лот № 1 – 207 480 000 белорусских рублей (с учетом НДС)** |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | **г. Витебск, пр. Московский, 53, 06 сентября 2011 года в 14.30** |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Хозяйственный суд Витебской области. 210101, г. Витебск, ул. Правды, д. 32, каб. 321, http:// vitebsk.court.by/ Судебный исполнитель Зуев Михаил Евгеньевич, тел./факс. (80212) 49 13 43, (8 044) 734 93 00, старший судебный исполнитель Бородулин Алексей Александрович, тел. (80212) 49 13 40; (8044) 746 73 00 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано: 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903000023 в 201 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Витебск, код 259, УНН 300007670, **не позднее 14 ч. 30 м. 06.09.2011 г.** Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

## КІРМАШ

штотыднёвы рэкламны выпуск № 31 (693)

аддзел рэкламы ☎ 287 17 79

### ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

**ПРАДАЕЦЦА**

❒ Катэдж (незавершаны, гатоўнасць 76%), маскоўскі напрамак, пас. Калодзішчы, 14 сотак, вада, газ, ёсць ТУ.

Тэл.: 8 017 208 26 13, 8 029 642 53 22.

❒ Помпа для а/м «Рэно-Шафран» у зборы.

Тэл. 8 029 391 38 49.

❒ А/м «Форд-Эскорт», 1994 г.в., хэтчбэк, 1,4, расход бензіну 5,5, добры стан, 2200 у.а.

Тэл. МТС 764 42 91.

❒ Дом з г/пабудовамі ля возера Укля, Браслаўскі раён.

Тэл. 8 029 292 30 21.

❒ Дом у добрым стане (8х9х3 м), чысты вугал, да вокнаў дубовыя вянкі, можна пад знос, Петрыкаўскі р-н, 70 км ад мяжы Мінскай вобл.

Тэл.: 8 01727 453 62, 8 033 634 35 36.

❒ Блок (18 м² + 10,5 м²) у інтэрнаце г. Пружаны Брэсцкай вобл.

Тэл. 8 029 528 57 63.

❒ Касілка ротарная новая (Польшча).

Тэл. 8 029 292 06 14.

❒ Трактар МТЗ-50, выдатны стан, малая напрацоўка. 4600 у.а.

Тэл. 8 029 589 54 18.

**РОЗНАЕ**

❒ Рэпетытар па рускай мове, вопытны настаўнік 5—11 кл. Тэсціраванне.

Тэл. 8 017246 20 45.

**ЗВЯЗДА — КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ**

**ЗАПОЎНІЦЕ РАЗБОРЛІВА, ВЫРАЖЦЕ І ВЫШЛІЦЕ НА АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.**

**АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ВАША ПРОЗВІШЧА, АДРАС, ХАТНІ ТЭЛЕФОН.**

Пашпарт, серыя_______ №_____________ Выдадзены ________________

Подпіс ____________________ Дата __________

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ по продаже неиспользуемого имущества с установлением начальной цены продажи недвижимого имущества, равной одной базовой величине

| **Наименование неиспользуемого имущества** | **Капитальное строение (здание отделения почтовой связи)** |
|---|---|
| **Местонахождение неиспользуемого имущества** | Брестская обл., Дрогичинский р-н, д. Малиновка, ул. Советская, д. 6 |
| **Продавец неиспользуемого имущества** | РУППС «Белпочта», (0162) 20 57 21 |
| **Сведения о неиспользуемом имуществе и информация о земельном участке** | Здание одноэтажное, сборно-щитовое, облицованное кирпичом, общая площадь 56,6 кв.м с холодной пристройкой, сарай, уборная. Земельный участок площадью 0,1014 га; срок аренды – 50 лет. |
| **Обязательные условия аукциона** | - осуществление предпринимательской деятельности в течение не менее трех лет с даты заключения договора купли-продажи, в том числе начало осуществления – не позднее 12 месяцев с даты заключения договора; - создание не менее двух дополнительных рабочих мест в течение 18 месяцев с даты заключения договора; - запрещение покупателю продажи, иного отчуждения до выполнения им условий договора. |
| **Начальная цена неиспользуемого имущества (в базовых величинах)** | 1 |
| **Размер задатка (в базовых величинах)** | 1 |
| **Реквизиты счета для перечисления задатка** | р/с 3642902530005 в Головном филиале по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538; срок внесения задатка – до подачи заявления на участие в аукционе |
| **Организатор аукциона** | **Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11, тел. (0162) 23 44 06, 21 19 82, 23 44 78, www.brest-region.by** |

Аукцион состоится **30 августа 2011 года** в **11.00** по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в республиканской собственности, с установлением начальной цены продажи, равной одной базовой величине, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 11 марта 2010 г. № 342.

К участию в аукционе допускаются негосударственные юридические лица, индивидуальные предприниматели, внесшие задаток в установленном порядке, подавшие заявление с приложением необходимых документов с соответствии с вышеназванным Положением, заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан: подписать протокол аукциона в день аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этого участка, после чего не позднее 2-х рабочих дней заключить с продавцом договор купли-продажи недвижимого имущества, а с местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты его проведения.

Извещение об открытом аукционе по продаже неиспользуемого имущества с установлением начальной цены продажи недвижимого имущества, равной одной базовой величине, ранее было опубликовано в газете «Звязда» от 29 июня 2011 г. № 120.

**Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 404, 405, 413, фонд «Брестоблимущество», с 9 августа 2011 г. в рабочие дни с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30; прием заявлений заканчивается 30 августа 2011 г. в 10.00.**

## ОДО «Арниус-М» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже имущества, расположенного по адресу: г. Гомель, м-н Мельников луг:

| № лота | Наименование имущества | Начальная цена лота, без НДС, руб. | Задаток 5%, без НДС, руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Незавершенное законсервированное капитальное строение – здание многоквартирного жилого дома, железобетонное ограждение | 1 381 546 800 | 69 077 340 |

Организатор торгов: управляющий в деле о банкротстве ООО «Диспонент»: г. Гомель, ул. Шилова, 2, ком. 2, тел./факс (80232) 60 51 31.

Продавец: ОДО «Арниус-М».

С имуществом можно ознакомиться по месту его расположения в рабочие дни с 9.00 до 17.00.

Задаток перечисляется до 17.08.2011 г. (включительно) на р/с 3012216100021 в ГФ ОАО «Белинвестбанк», код 151501786, УНП 490314115.

Условия продажи – без условий.

Шаг аукциона в размере 9% от начальной цены.

После окончания торгов с победителем подписывается протокол и в течение 20 дней заключается договор. Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течение 30 дней после подписания протокола.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки.

Затраты на организацию и проведение торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам торгов документации, необходимой для их проведения, возмещаются победителем торгов.

Для участия в аукционе необходимо подать письменное заявление установленной формы (подробности по тел.) с приложением: копии платежного поручения о внесении суммы задатка, для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей – заверенная копия свидетельства о гос. регистрации; для физ. лиц – копия паспорта либо иного документа, удостоверяющего личность.

Срок подачи заявления: с момента выхода настоящего объявления до 16.00 17.08.2011 года по адресу: г. Гомель, ул. Шилова, 2, к. 2.

Дата, время, место проведения открытого аукциона: 18.08.2011 года в 12.00, г. Гомель, ул. Шилова, 2, ком. 2.

**По вопросам участия в аукционе и приобретения имущества должника обращаться по телефонам: (8 029) 621 22 36 или (80232) 60 51 31. Дополнительная информация: www.disponent.by**

Здарэнні

## ЗГАРЭЎ ПРАЗ ГОД ПАСЛЯ БРАТА

**Большасць ахвяраў пажараў — нецвярозыя людзі.**

Пакуль бацькі Івана і Анатоля Казловых з вёскі Буда Горацкага раёна былі жывыя, яны дбалі пра сыноў — тушылі акуркі цыгарэт і своечасова выносілі з хаты бялізну з ложкаў, якая тлела.

Без бацькоўскага догляду і клопату летась напрыканцы ліпеня да Казловых прыйшла бяда. На пажары, які здарыўся з-за неасцярожнасці пры курэнні, загінуў адзін з братоў. Роўна праз год, 27 ліпеня 2011 года, мужчына адзначаў год па брату і наладзіў памінкі. Увечары не абышлося без спіртных напояў і цыгарэт, а ўначы хата загарэлася. Загінулі гаспадар хаты і яго прыяцель.

— Самай распаўсюджанай прычынай пажараў і гібелі на іх людзей ад году ў год застаецца неасцярожнае абыходжанне з агнём, у тым ліку пры курэнні ў нецвярозым стане, — нагадвае **інспектар Цэнтра прапаганды і навучання пры Магілёўскім абласным упраўленні МНС Аляксандра ГРАБЕННІКАВА**. — За 7 месяцаў у Магілёўскай вобласці адбылося 642 пажары, на якіх загінула 108 чалавек. Колькасць ахвяраў — удвая (!) большая, чым за такі ж перыяд летась. Прычым 96% людзей, якія загінулі на пажарах, былі ў той момант нецвярозымі.

**Ілона ІВАНОВА.**

## АЎТОБУС З БЕЛАРУСАМІ ТРАПІЎ У ДТЗ ПАД ТУЛАЙ

**Адзін чалавек загінуў, пяцёра параненыя ў дарожна-транспартным здарэнні ў Заокскім раёне Тульскай вобласці, паведамляюць інфармагенцтвы.**

Паводле папярэдніх даных, мікрааўтобус з беларусамі, які ехаў з Беларусі ў напрамку Масквы, 6 жніўня каля 9 гадзін па маскоўскім часе сутыкнуўся з панэлевозам.

**БЕЛТА.**

## ГРУЗАВІК СПЫНІЎСЯ Ў... АГАРОДЗЕ

**Паводле інфармацыі Гродзенскай абласной Дзяржаўтаінспекцыі, гэта здарылася ў нядзелю ў пасёлку Пагранічны Бераставіцкага раёна.**

Кіроўца аўтапоезда «Івека», рухаючыся з боку дзяржаўнай мяжы, паехаў на чырвоны сігнал светлафора і на цэнтральным перакрыжаванні не разышоўся з трактарам «МТЗ», які перавозіў збожжа. Ад удару трактарны прычэп перакуліўся, а грузавік, спрабуючы пазбегнуць сутыкнення, знёс знак «Пешаходны пераход», агароджу і спыніўся ў агародзе адной з сядзібаў.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## У МІНСКУ СУТЫКНУЛІСЯ ДВА МАТАЦЫКЛЫ

**Кіроўца аднаго з іх дзяўчына не заўважыла святлафор.**

Каля гадзіны ночы 7 жніўня на праспекце Незалежнасці ў Мінску сутыкнуліся матацыклы Кавасакі (ім кіравала дзяўчына 1987 г.н.) і Сузукі, (кіроўца — малады чалавек 1985 г.н.). Як паведамляе ДАІ Мінгарвыканкама, дзяўчына атрымала цялесныя пашкоджанні і была змешчана ў бальніцу хуткай дапамогі.

Паводле слоў кіроўцы Сузукі, ён рухаўся па праспекце Незалежнасці і на скрыжаванні з вуліцай Філімонава спыніўся на святлафоры. І тут жа адчуў моцны ўдар у заднюю частку свайго матацыкла. Па факце ДТЗ праводзіцца праверка.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

## ЗАХРАСЛА Ў ПОРУЧНЯХ

**У Мінску чарговае здарэнне з дзіцем: выратавальнікі зноў вызвалялі «з палону» нагу дзяўчынкі, якая захрасла ў поручнях металічнай горкі.**

Пра сітуацыю ў двары аднаго з дамоў па вуліцы Цімашэнкі ў 17 гадзін у цэнтр аператыўнага ўпраўлення пры Мінскім гарадскім упраўленні МНС паведаміла выпадковая сведка. На месца быў накіраваны аўтамабіль хуткага рэагавання і брыгада хуткай медыцынскай дапамогі. У пацярпелай — Аляксандры, 2006 года нараджэння — захрасла правая нага. Пасля вызвалення яе «з палону» дзяўчынка ў шпіталізацыі патрэбы не мела.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## АДЗІН НЕАСЦЯРОЖНЫ РУХ — І ТРАГЕДЫЯ

**Толькі за апошнія тры дні мінулага тыдня некалькі трагедый адбылося на ўборачных работах у Брэсцкай вобласці.**

63-гадовы камбайнер ААТ «Дружба» Баранавіцкага раёна праціраў шкло ў кабіне камбайна і выпадкова зачапіў рычаг кіравання гідраходу машыны. Камбайн пачаў адвольны рух, у выніку чаго быў траўмаваны памочнік камбайнера. Па дарозе ў бальніцу 54-гадовы мужчына памёр.

У вёсцы Горталь Івацэвіцкага раёна 28-гадовы механізатар таксама працаваў на ўборцы. Трактарам ён наехаў на 38-гадовую жанчыну, брыгадзіра гаспадаркі, якая ляжала ў траве. Чаму брыгадзір ляжала ў траве а шостай гадзіне вечара, высвятляе зараз следства.

На збожжатаку вёскі Наліўкі Івацэвіцкага раёна загінуў падлетак. 13-гадовы вучань мясцовай школы атрымаў смяротны ўдар бартом трактара, які прывёз збожжа.

**Яна СВЕТАВА.**

## Дзве даты

## 9 жніўня

***Міжнародны дзень карэнных народаў свету.***

**1917 год** — выйшаў першы нумар газеты «Звязда», органа Мінскага камітэта РСДРП (б). Неаднаразова забаранялася Часовым Урадам, таму вымушана была мяняць назву (з 28 верасня называлася «Молат», з 21 кастрычніка — «Буравеснік», з 14 лістапада — ізноў «Звязда»). З'яўляецца першай легальнай бальшавіцкай газетай у Беларусі. Арганізатары і першыя рэдактары — В. Г. Кнорын, К. І. Ландар, А. Ф. Мяснікоў, В. В. Фамін, М. В. Фрунзэ. У гады Вялікай Айчыннай вайны выдавалася ў Магілёве, Гомелі, нелегальна ў Мінску. Ёй належыць выключная роля ў разгортванні мінскага падполля — у 1942 годзе ў якасці органа Мінскага падпольнага камітэта КПБ выйшла 4 нумары газеты. Рэдактары У. С. Амельянюк, Я. М. Савіцкая. У 1943-44 гадах выдавалася падпольна як орган ЦК КПБ і Мінскага абкама КПБ (рэдактар М. П. Барашкаў). У Мінску і вёсцы Дварэц Любанскага раёна на будынках, дзе падпольна друкавалася «Звязда», устаноўлены мемарыяльныя дошкі. З 10 ліпеня 1944 выдаецца ў Мінску.



**1483 год** — адкрыта славутая Сікскцінская капела. Былая дамавая царква ў Ватыкане. Пабудавана архітэктарам Джорджэ дэ Дольчы па замове папы Рымскага Сікста IV, адкуль і назва. Зараз Капела — музей, вядомы помнік Адраджэння. У 1508—1541 гадах над роспісам сцен і алтара тут працаваў Мікеланджэла. З канца XV стагоддзя менавіта тут збіраюцца канклавы кардыналаў, дзе выбіраюць рымскіх пантыфікаў.

## Цытата дня

***«Чалавеку патрэбна два гады, каб навучыцца гаварыць, і шэсцьдзесят гадоў, каб навучыцца трымаць язык за зубамі».***

**Ліён Фейхтвангер (1884—1958), нямецкі пісьменнік.**

## МИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ 8 сентября 2011 г. ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь в Минском районе

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь земельного участка | Целевое назначение | Расходы по подготовке документации (рублей) | Начальная цена земельного участка (рублей) | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Горанский с/с, д. Новоселье | 623681315601000497 | 0,1483 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 301 957 | 26 000 000 | 2 600 000 |
| 2 | Ждановичский с/с, п. Ратомка, участок № 92 | 623681708601002766 | 0,1420 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 2 500 000 | 54 000 000 | 5 400 000 |
| 3 | Ждановичский с/с, п. Ратомка, участок № 149 | 623681708601002764 | 0,1500 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 2 500 000 | 57 000 000 | 5 700 000 |
| 4 | г. Заславль, ул. Береговая, 2 | 623650100001004367 | 0,1000 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 171 210 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 5 | Луговослободской с/с, д. Обчак | 623684109101000675 | 0,0760 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 267 697 | 15 000 000 | 1 500 000 |
| 6 | Луговослободской с/с, д. Синило | 623684110601000266 | 0,1929 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 875 330 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 7 | Луговослободской с/с, д. Синило | 623684110601000264 | 0,1926 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 875 330 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 8 | Луговослободской с/с, д. Синило | 623684110601000265 | 0,1950 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 875 330 | 41 000 000 | 4 100 000 |
| 9 | Луговослободской с/с, д. Синило | 623684110601000263 | 0,1903 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 875 330 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 10 | Луговослободской с/с, д. Синило | 623684110601000261 | 0,1921 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 875 330 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 11 | Луговослободской с/с, д. Синило | 623684110601000262 | 0,1908 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 875 330 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 12 | Михановичский с/с, д. Плебанцы, участок № 2 | 623684205601000120 | 0,1633 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 200 000 | 34 000 000 | 3 400 000 |
| 13 | Михановичский с/с, д. Плебанцы, участок № 1 | 623684205601000119 | 0,1715 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 200 000 | 36 000 000 | 3 600 000 |
| 14 | Папернянский с/с, д. Лапоровичи, участок № 38 | 623685505101000338 | 0,1572 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 214 870 | 42 000 000 | 4 200 000 |
| 15 | Папернянский с/с, д. Лапоровичи, участок № 39 | 623685505101000339 | 0,1608 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 214 870 | 43 000 000 | 4 300 000 |
| 16 | Папернянский с/с, д. Лапоровичи, участок № 40 | 623685505101000340 | 0,1556 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 214 870 | 41 000 000 | 4 100 000 |
| 17 | Петришковский с/с, д. Новашино | 623685707101000290 | 0,1808 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 84 000 | 28 000 000 | 2 800 000 |
| 18 | Петришковский с/с, д. Новашино | 623685707101000145 | 0,1529 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 84 000 | 25 000 000 | 2 500 000 |
| 19 | Петришковский с/с, д. Новашино | 623685707101000029 | 0,1726 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 84 000 | 28 000 000 | 2 800 000 |
| 20 | Петришковский с/с, а/г Петришки | 623685707601000637 | 0,1435 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 84 000 | 30 000 000 | 3 000 000 |
| 21 | Самохваловичский с/с, д. Слобода, участок № 175 | 623686304601000580 | 0,1255 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 529 000 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 22 | Самохваловичский с/с, д. Слобода, участок № 176 | 623686304601000579 | 0,2000 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 529 000 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 23 | Самохваловичский с/с, д. Слобода, участок № 177 | 623686304601000578 | 0,1738 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 529 000 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 24 | Самохваловичский с/с, д. Валицковщина, участок № 1 | 623686301101000093 | 0,1496 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 529 000 | 20 000 000 | 2 000 000 |
| 25 | Самохваловичский с/с, д. Валицковщина, участок № 2 | 623686301101000094 | 0,1837 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 529 000 | 20 000 000 | 2 000 000 |
| 26 | Щомыслицкий с/с, д. Прилукская Слобода, участок № 138 | 623688006601000480 | 0,1485 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 345 270 | 91 000 000 | 9 100 000 |
| 27 | Щомыслицкий с/с, д. Прилукская Слобода, участок № 215 | 623688006601000479 | 0,1500 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | 1 345 270 | 92 000 000 | 9 200 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: **08.09.2011 г. в 10.00.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: 02.09.2011 г. в 17.00. Контактный телефон: 204 11 62.

Задаток за участие в аукционе на Лот 1 перечисляется на расчетный счет № 3600621020043 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052360, код платежа – 04901.

На Лоты 2–3 перечисляется на расчетный счет № 3600621030059 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052317, код платежа – 04901.

На Лот 4 перечисляется на расчетный счет № 3641621200079 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600012999, код платежа – 04901.

На Лоты 5–11 перечисляется на расчетный счет № 3641900000075 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600219251, код платежа – 04901.

На Лоты 12–13 перечисляется на расчетный счет № 3641900000105 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600303747, код платежа – 04901.

На Лоты 14–16 перечисляется на расчетный счет № 3600621120145 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052411, код платежа – 04901.

На Лоты 17–20 перечисляется на расчетный счет № 3600621130151 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052386, код платежа – 04901.

На Лоты 21–25 перечисляется на расчетный счет № 3641900000088 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052424, код платежа – 04901.

На Лоты 26–27 перечисляется на расчетный счет № 3600621180202 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052373, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае местный исполнительный комитет в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся принимает решение о предоставлении единственному участнику земельного участка в частную собственность. В течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения гражданин обязан внести плату за земельный участок в размере его начальной цены, увеличенной на 5%, возместить расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона).

<u>Документы, необходимые для участия в аукционе:</u>

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.

3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

3.1 представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

# СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.




**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** Агрэст. Клубніцы. «Орас». Крым. Бал. Фаза. Кукса. Вежа. Ярмо. Кед. Барон. Манерка. Аск. Лак. Найб. Намер. Суніцы. Палітра. Кон. Страла. Сакэ. Дата. Базар. Спас. Тустэп. Ласо. Уран. Парэчкі. **Па вертыкалі:** Вымя. Унук. Ажыны. Анод. Міна. Кравец. Тост. Алекс. Рыса. Тхор. Дака. Сусла. Рыба. Строп. Тан. Крама. Арэс. Лір. Плёс. Пол. Каа. Кобрын. Аліса. Каралі. Таз. Аборка. Заказнік. Аэрасані.

## Усміхнемся!

Муж — жонцы:

— Дарагая, мо ты спяеш нам сёння?

— Але ж, дарагі, госці ўжо разыходзяцца!

— Так, аднак робяць яны гэта занадта марудна і неахвотна...

☺

**Выйшаў новы бестселер для жанчын «Як знайсці мужчыну сваёй мары і што потым рабіць з гэтым нягоднікам».**

☺

Сустракаюцца два мужыкі, адзін у другога цікавіцца:

— Пойдзеш сёння на рыбалку?

— Не.

— Чаму?

— А я ў гараскопе прачытаў, што сёння спрыяльны дзень для рыбаў.

☺

**Размаўляюць Зямля з Марсам. Зямля скардзіцца:**

**— Людзі на мне завяліся, паратунку ад іх няма ніякага.**

**Марс:**

**— Ды нічога страшнага. На мне таксама былі. Перавяліся!**




# ПАЦЯРПЕЛІ ВАЛЮТЧЫКІ, А ТАКСАМА ІХ КЛІЕНТЫ

**У Бабруйску затрыманы 40-гадовая мінчанка і 23-гадовы бабруйчанін пры спробе нелегальнага абмену 1100 долараў.**



Такі вынік далі мерапрыемствы па кантролі за незаконным абарачэннем валюты, якія правялі ўпраўленне Дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК Магілёўскай вобласці сумесна з УУС Бабруйскага гарвыканкама. Жанчына і мужчына на працягу ліпеня займаліся незаконным набыццём, продажам і абменам валюты. Такія паслугі валютчыкі рабілі і для выпадковых людзей, якія імкнуліся абмяняць грошы па больш выгадным курсе, і для пастаянных кліентаў — індывідуальных прадпрымальнікаў і прадстаўнікоў камерцыйных структур. Акрамя гэтага, бабруйчанін летась прыцягваўся да крымінальнай адказнасці за незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць, звязаную з рэалізацыяй мабільных тэлефонаў, у тым ліку і за валюту.

Таму ў дачыненні да затрыманых складзены пратаколы аб адміністрацыйным правапарушэнні і канфіскаваны грашовыя сродкі — 70,5 мільёна рублёў і 500 еўра. УДФР таксама звяртае ўвагу, што не толькі самі валютчыкі падпадаюць пад адказнасць за парушэнне законнага парадку валютных аперацый, але і іх кліенты. Згодна з заканадаўствам, яны могуць атрымаць штраф да 100 базавых велічынь з канфіскацыяй прадмета парушэння, а менавіта грошай.

**Ілона ІВАНОВА.**

**Фота УДФР КДК Магілёўскай вобласці.**

# СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.36 | 20.53 | 15.17 |
| Віцебск — | 5.21 | 20.47 | 15.26 |
| Магілёў — | 5.26 | 20.43 | 15.17 |
| Гомель — | 5.29 | 20.34 | 15.05 |
| Гродна — | 5.52 | 21.07 | 15.15 |
| Брэст — | 5.58 | 21.02 | 15.04 |

**Месяц**

*Першая квадра 6 чэрвеня.*
*Месяц у сузор'і Казярога.*

**Імяніны**

*Пр. Анфісы, Марфы, Германа, Клімента, Мікалая, Навума, Панцеляймона, Савы.*

*К. Ірыны, Клары, Тэрэзы, Эдзіты, Рамана, Рамуальда.*



Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.




# НЕ ЛАМАЙ ДУБОК

Свет і сусвет чалавека

**Дуб заўсёды быў сімвалам мужчынскага пачатку. Калі нявеста хацела, каб у сям'і нараджаліся хлопчыкі, то ў момант уваходу ў дом жаніха яна ціхенька казала: «Каля двара дубочкі, а ў хаце сыночкі».**

● Бабка-павітуха імкнулася абразаць пупавіну пасля нараджэння хлопчыка на дубовай плашцы, каб нованароджаны вырас дужым і здаровым. Пасля купання хлопчыка ваду таксама стараліся выліць пад дуб, каб немаўля было даўгавечным.

● Нашы продкі верылі ў тое, што свяшчэннае дрэва можа дапамагчы змадэляваць жыццё чалавека і паўплываць на яго долю. На беларускім Палессі існаваў звычай: пасля нараджэння дзіцяці пасадзіць дуб. Часам дзіця само павінна было пасадзіць малады дубочак, каб той рос, набіраў моц і прадказваў будучыню дзіцяці. Калі ж раптам дуб засыхаў, то гэта лічылі прадказаннем цяжкой хваробы.

● Знахары выкарыстоўвалі дуб як сімвал мужчынскага пачатку, а бярозу — жаночага. Каб аб'яднаць маладую заручаную пару, трэба было напаіць абаіх адварам з трэсак або травы, сабраных у тым месцы, дзе зрасліся дуб і бяроза.

● Дуб выкарыстоўвалі і ў пахавальнай абраднасці. З яго выдзёўбвалі калоды, а пазней рыхтавалі труну або крыжы. З гэтай нагоды і ўзніклі цікавыя фразеалагізмы: «Даць дуба», «адубець», «глядзець у дуба».

● У асяроддзі ўсходніх славян шырока бытавала павер'е: дуб, які вырас у двары, каля хаты, дзе-небудзь на прысядзібным участку, «выжывае» гаспадара гэтага дома. Верылі ў тое, што, як толькі дуб вырасце і набярэ моц, з гаспадаром здарыцца бяда: дуб забярэ яго жыццёвую сілу.

● З далёкіх часоў у народзе існавала забарона зразаць дубы. Лічылася, што любыя дзеянні, накіраваныя супраць свяшчэннага дрэва (зрэзаць, зламаць галінку, прынесці засохлае галлё на дровы, зняць кару) нашлюць няшчасці на таго чалавека, а часам і на тых, хто жыве паблізу.

● У той жа час лічылі: «Хто будзе спаць на дубовых дошках, той будзе даўгавечны і здаровы, як дуб».

● Калі вясной пачуеш першы гром, трэба пацерціся спінай аб дуб — увесь год не будзе балець спіна.

● Дуб — магутны донар лячэбнай энергіі, таму яго шырока выкарыстоўвалі ў народнай медыцыне. Каб пазбавіць дзіця ад такіх цяжкіх хвароб, як эпілепсія, рахіт, малярыя, бяссонніца, яго «прапускалі цераз дуб» — адтуліну, якая ўтваралася пасля ўдару маланкі. Пасля гэтага дрэва туга звязвалі. Дрэва паступова зрасталася — дзіця дзень за днём набірала моц.

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар НАРКЕВІЧ Уладзімір Браніслававіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, В. ПАЗНЯКОЎ.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, бухгалтэрыі: 292 22 03.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 3779.

Нумар падпісаны ў 19.30 8 чэрвеня 2011 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12